# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 5 чэрвень 2011


"Сеткавыя" рэвалюцыянеры і апазіцыя – с. 2

Выбары па партыйных спісах: у чым плюсы? – с. 3

Дэвальвацыя даверу – с. 6

Крызіс і вёска – с. 7


# Моц духу

**Актывіст Руху "За Свабоду" Мікіта Ліхавід – адзіны з пакараных рэпрэсіўнай сістэмай удзельнікаў Плошчы, хто прынцыпова адмаўляецца называць сябе асуджаным па законе і выконваць правілы "зоны". За гэта ў Наваполацкай калоніі, якая вядомая сваім жорсткім рэжымам, яго ўжо чацвёрты раз (!) за перыяд трохі больш за месяц зачынілі ў штрафны ізалятар.**



Мы з вамі жывём у адной вязніцы, у якую Лукашэнка ператварыў Беларусь, а Мікіта Ліхавід цвёрда трымаецца і трывае, ахвяруючы здароўем, у турэмным карцары. Гэта турма ў кубе!

Дасведчаныя ж людзі кажуць пра раўназначную шкоду здароўю ад галадоўкі і доўгага знаходжання ў карцары.

Лідар Руху "За Свабоду" напісаў ліст да начальніка Наваполацкай калоніі №10, куды змясцілі адбываць несправядлівае пакаранне Мікіту Ліхавіда. У ім Аляксандр Мілінкевіч выказаў занепакоенасць суворым стаўленнем турэмшчыкаў да 21-гадовага актывіста, што "ставіць пад пагрозу жыццё і здароўе маладога чалавека".

Лідар Руху "За Свабоду" нагадаў начальніку калоніі, што беларуская і міжнародная дэмакратычная грамадскасць уважліва сочаць за лёсам палітычных вязняў у Беларусі і заклікаў самога і падначаленых ставіцца да іх гуманна і з павагай, выконваць нормы дзейнага беларускага заканадаўства, а таксама міжнародныя гуманітарныя акты, ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь.

Адміністрацыя калоніі даводзіць, што ў адносінах да Мікіты Ліхавіда дзейнічае ў адпаведнасці з законам і міжнароднымі нормамі. Паводле начальніка Папраўчай калоніі №10 Упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці спадара Аляксандра Сівохі, асуджаны Мікіта Ліхавід адмаўляецца ад выканання абавязкаў, усталяваных крымінальна-выканаўчым заканадаўствам, а таму быў пакараны пасяленнем у штрафны ізалятар.

Між тым, высветлілася, што Мікіту Ліхавіда караюць карцарам не толькі за тое, што ён, скажам, адмаўляецца, рабіць зарадку – і гэта, маўляў, дрэнны прыклад антыдысцыпліны для астатніх зняволеных.

Паводле аднаго з пратаколаў, з якім азнаёмілася адвакатка палітвязня Дар'я Ліпкіна, яго змясцілі ў ізалятар за тое, што не данёс на сукамернікаў.

Адным днём Мікіта Ліхавід быў прызначаны дзяжурным па камеры, а праверка выкрыла, што некаторыя асуджаныя мелі цыгарэты. Рухаўца пакаралі за тое, што не паведаміў ахоўнікам пра забароненыя рэчы. Зразумела, што такіх нагодаў для абцяжарвання ўмоваў у калоніі для Ліхавіда можна адшукаць колькі заўгодна і калі заўгодна.

Мікіта ж трымаецца сваёй пазіцыі: калі ён нават уздыме на зарадцы рукі, то сімвалічна здасца перад рэжымам, які незаконна яго асудзіў на 3,5 года за нібыта масавыя беспарадкі 19 снежня, у дзень прэзідэнцкіх выбараў. Ягоная маці спрабуе ўгаварыць паберагчы здароўе, якое спатрэбіцца ў палітычнай барацьбе, але разам з ты ганарыцца трываласцю духу сына.

У калонію Мікіту этапавалі 7 траўня – і ўжо праз два дні ён патрапіў на 10 сутак у штрафны ізалятар. Адбыўшы гэтае пакаранне, праз дзень – туды ж ужо на 15 сутак. Там ён сустрэў свой 21-ы дзень народзінаў – такі вось "падарунак". Затое ў гэты дзень палітвязень меў спатканне з маці.

Алена Ліхавід распавяла Праваабарончаму цэнтру "Вясна" пра тое, якім убачыла свайго сына і што ведае пра яго будні ў зняволенні.

– Калі мы збіраліся на спатканне 27-га траўня, то папярэдне патэлефанавалі і даведаліся аб тым, што Мікіта зноў у ШІЗА, атрымаў 15 сутак. Адміністрацыя калоніі паставіла нас перад выбарам – пусціць на спатканне або адваката, або мяне. І яны самі прапанавалі, каб прыехала маці – як бы ў выхаваўчых мэтах. Я паехала.

**Працяг на с. 4-5**

# “Сеткавыя” рэвалюцыянеры і апазіцыя


“Народныя гулянні” у Мінску 15 чэрвеня.

**Кіраўнік гомельскай абласной арганізацыі Руху “За Свабоду” Пётр Кузняцоў адкрыта падтрымаў народную акцыю “Рэвалюцыя праз сацыяльную сетку” 15 чэрвеня, за што ледзь не стаў абвінавачаным па крымінальнай справе.**

У гэты дзень па дарозе на плошчу Леніна ў Гомелі актывіст быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі нібыта таму, што яго прыкметы цалкам супадаюць з прыкметамі чалавека, які скраў у цэнтры горада ў прахожай залаты ланцужок коштам 7 мільёнаў рублёў. Пасля дзвюх з паловай гадзінаў допытаў рэгіянальнага лідэра ўсё ж адпусцілі і паабяцалі больш па гэтай справе не турбаваць.

Свае матывы што да “маўклівай рэвалюцыі”, а таксама паводзіны ўладаў Пётр Кузняцоў пракаментаваў Рух.by:

– У сацыяльнай сетцы “Вконтакте”, адкуль пайшла ініцыятыва гэтай акцыі, зарэгістравана больш за 2 мільёны беларусаў. Гэта не проста вялікая аўдыторыя, гэта – народ.

Я не адношу сябе да старой партыйнай палітычнай апазіцыі: я ў Руху адносна нядаўна і займаюся больш грамадскай і інфармацыйнай працай. Але лічу, што апазіцыя павінна быць там, дзе людзі. Усё роўна, як яны самаарганізуюцца: праз сацыяльныя сеткі, на лаўках або ў чэргах ля абменнікаў.

Але пратэст, які пачынаецца стыхійна, павінен стаць палітычным, інакш ён не дасць вынікаў!

І тым больш дзіўна, што большасць лідараў грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазіцыі ставяцца да хвалі сацыяльна-сеткавых пратэстаў досыць пасіўна.

Што тычыцца эпізода з маім затрыманнем, то, як я і сказаў: калі стыхійны пратэст не становіцца палітычным, ён можа прынесці толькі тактычныя, але не стратэгічныя вынікі.

Мабыць, так думае і ўлада, таму прадпрымае дзеянні, накіраваныя на тое, каб падзяліць “традыцыйныя” апазіцыйныя сілы і народ.



Але для ўлады сітуацыя пагаршаецца з кожным днём. І яшчэ невядома, што насамрэч адбудзецца: сыдзе хваля пратэстаў (у гэта я асабіста ўжо не веру), народ аб’яднаецца з апазіцыяй і дэмакратычнай супольнасцю, альбо людзі, час і падзеі вылучаць новых яркіх лідараў.

Сёння ясна адно: так, як было раней, ужо не будзе. Я маю на ўвазе тое “апазіцыйнае гета”, у якім шмат гадоў знаходзіліся дэмакратычныя актывісты. Сёння апазіцыя – гэта ўвесь народ, і мы, апазіцыя “традыцыйная”, павінны быць разам з усімі.

# Парад у крэдыт



По віне ўладаў Беларусь сёння знаходзіцца ў глыбокім эканамічным і палітычным крызісе. Аднак някруглая дата 3 ліпеня (Мінск ад фашыстаў у гэты дзень вызвалялі ў 1944 годзе) будзе на шырокую нагу святкавацца як Дзень Незалежнасці (незалежнасці ўладаў ад народу?). Рыхтуецца правядзенне параду з ваеннай тэхнікай: па цэнтры сталіцы праедуць баявыя машыны часоў Другой сусветнай вайны і сучасныя мадэлі, а ў неба на шоў-палёты ўздымуцца самалёты.

Рух “За Свабоду” заклікае адмяніць пампезны ваенны парад у гэты нялёгкі для краіны і яе грамадзянаў час. Дзяржава ў каго толькі можна просіць крэдытаў, не аддаўшы яшчэ мільярды долараў папярэдніх пазыкаў, узровень жыцця беларусаў імкліва падае, а ўлады недарэчна ладзяць дарагое мерапрыемства.

Ва ўмовах такога неабгрунтаванага і марнатраўнага шыкавання беларусы маюць поўнае маральнае права разам з ушанаваннем памяці загінулых за Беларусь, выказаць свой пратэст кіраўніцтву краіны, якое працягвае жыць не сродках і спавядае няхітры прынцып – залагодзіць народ відовішчамі.

# Выбары па партыйных спісах: у чым плюсы?

**У межах кампаніі ”Народная праграма” адбылося абмеркаванне тэмы “Якія перавагі мае прапарцыйная выбарчая сістэма для Беларусі?”.**

Беларускі электарат цяпер перастаў разглядаць выбары як механізм змены ўлады, асабліва гэта тычыцца мясцовых і парламенцкіх выбараў, адзначае каардынатар Руху “За Свабоду” па Магілёўшчыне **Алесь Сілкоў**.



Так, рэальная яўка на мясцовыя выбары склала ад 15% у Мінску да 25% у абласных цэнтрах, у выбаршчыкаў адсутнічае магчымасць кантраляваць дэпутата ад акругі, а таксама ўплываць сваім меркаваннем на прынятце рашэнняў, а падзеі снежня 2010 года і наступны крызіс спарадзілі новыя палітычныя выклікі і пытанні, на якія адказ павінны даваць палітычныя партыі, а не “моцныя гаспадарнікі і барацьбіты за чысты двор”, лічыць Сілкоў.

І, заўважае ён, “улада разумее, што на чарговыя парламенцкія выбары ўвосень 2012 года немагчыма будзе забяспечыць 50% яўку выбаршчыкаў, і толькі ўдзел палітычных партыяў можа прыцягнуць насельніцтва. Крызіс і распачатыя “нясмелыя спробы дыялогу з Захадам”, сведчаць аб зацікаўленасці уладаў у такім удзеле. З боку ўладаў, увядзенне прапарцыйнай выбарчай сістэмы ў Беларусі можа стаць паўнавартаснай саступкай Захаду за пэўныя прэферэнцыі гаспадарчага парадку”.

Увядзенне прапарцыйнай сістэмы дазволіць удыхнуць жыццё ў палітычныя партыі Беларусі і грамадзянскую супольнасць, “паколькі моцная грамадзянская супольнасць можа быць толькі пры наяўнасці моцных палітычных партыяў.

Аднак, на прыняцце рашэння наконт таго, быць ці не быць прапарцыйнай выбарчай сістэме ў Беларусі, існуе вельмі мала рычагоў ўплыву. Самы галоўны аргумент апанентаў: без змены ўсёй сістэмы выбарчага заканадаўства, правядзенне выбараў па прапарцыйнай сістэме не зменіць агульнапалітычнай сітуацыі і, адпаведна, не вырашыць названых вышэй праблем”.



А вось палітолагу **Юрыю Чавусаву** ўяўляецца, “што актуальнасць пераходу Беларусі да прапарцыйнай выбарчай сістэмы з’яўляецца надуманай. Гэтае пытанне штучна уносіцца ў палітычны парадак дня перад парламенцкімі выбарамі ў якасці магчымага “ключа” да дэмакратызацыі выбарчага працэсу”.

Больш за тое, лічыць эксперт, “з пункту гледжання інтарэсаў дэмакратычнай апазіцыі і дэмакратычных палітычных партый, змагацца за дэкларававаныя імі мэты зручней у рамках мажарытарнай выбарчай сістэмы – праз непасрэдны кантакт з выбаршчыкам ў пэўнай акрузе. Мажарытарная сістэма проста змушае беларускіх апазіцыянераў дзейнічаць за межамі сталіцы. Пры пераходзе да выбараў па партыйных спісах, баюся, актыўнасць апазіцыі абмяжуецца толькі Мінскам ды Мінскім раёнам”.

Чавусаў адзначае, што “пераход Казахстана да прапарцыйнай выбарчай сістэмы з’яўляецца красамоўным прыкладам таго, як ён можа служыць сродкам канчатковага знішчэння палітычнай апазіцыі ў постсавецкіх краінах. Расія ў дадзеным выпадку таксама ілюструе падобную стратэгію кіруючага рэжыму, хоць сітуацыя там і не настолькі кепская”.

Змену палітычнага клімату ў краіне можна сабе ўявіць і без адыходу ад мажарытарнай сістэмы, кажа эксперт: “У той жа час, такія праблемы, як ашуканскі падлік галасоў, масавы прымус да датэрміновага галасавання, парушэнне тайны галасавання, непрадстаўленасць у выбарчых камісіях апазіцыі – гэтыя праблемы не вырашаюцца адным толькі пераходам да прапарцыйнай сістэмы. У той жа час верагодна, што магчымы пераход да прапарцыйнай сыстэмы будзе прадстаўлены беларускімі ўладамі ў якасці кроку па дэмакратызацыі краіны – якім ён на самай справе можа і не з’яўляцца”.



Галоўным плюсам прапарцыйнай сістэмы, паводле юрыста **Уладзіміра Лабковіча**, ёсць тое, што парламент, прадстаўлены палітычнымі суб’ектамі, будзе прафесійным: “І дэпутаты-прафесіяналы будуць разумець і ажыццяўляць тое, што патрэбна для развіцця краіны. Выбаршчыку пры гэтым будзе лёгка арыентавацца ў тым, якую палітыку будуць праводзіць сілы, якія пройдуць у парламент”.

Але на першым этапе, на думку эксперта, аптымальным будзе падчас першых дэмакратычных выбараў пераход на змешаную сістэму, бо гэта дазволіць умацаваць палітычныя партыі, аслабленыя цяпер, і не дасць адасобіцца кіруючым элітам: “Змешаная сістэма павялічыла б шанцы апазіцыі. Калі б, канешне, не ўводзіўся нейкі непераадольны бар’ер. У выпадку ж ўсталявання яго на ўзроўні традыцыйных у еўрапейскіх краінах 3-5% партыі і асабліва блокі яго б, безумоўна, пераадолелі. Не дапусціць гэта было б тэхнічна вельмі складана – давялося б ісці на проста татальныя фальсіфікацыі”.

P.S. Свае меркаванні па гэтай ды іншых праблемах у самых розных сферах вы можаце выказаць на сайце кампаніі “Народная праграма” – Prahrama.by.

# Моц духу

Працяг са с.1

Спатканне доўжылася гадзіну ў кабінеце ў намесніка начальніка калоніі па выхаваўчай частцы. А перад гэтым адбылася гутарка з начальнікам калоніі. Ён перапыніў сваю нараду і пайшоў на тое, каб са мной пагаварыць. Сказаў, што ўсё разумее, інтэрнет і газеты чытае і, натуральна, у курсе ўсяго таго, што адбываецца. Сказаў, што размаўляў з Мікітам і разумее, што ён не крымінальнік і такіх, як ён, шмат, і да іх такія яшчэ прыедуць...

Дзесьці я і кіраўніцтва калоніі разумею: закрыць вочы на тое, што Мікіта адмаўляецца выконваць умовы калоніі, яны не могуць, таму што на яго глядзяць іншыя. І каб не пайшла хваля, натуральна, яны ўжываюць да яго такія меры пакарання. І ў размове начальнік калоніі даў зразумець, што пакуль ён прымяняе да Мікіты больш мяккія меры, а можа прымяніць і больш жорсткія. Але куды ўжо больш жорстка – мне цяжка сказаць.

**– За месяц знаходжання ў калоніі Мікіту давялося паспытаць нямала. Якім Вы ўбачылі свайго сына, ён нешта расказваў пра ШІЗА?**

– На спатканне ён прыйшоў у спецыяльнай вопратцы – усё такое шырокае, а на ім яно ўвогуле балахонам усё вісіць. На спіне вялікімі літарамі напісана "ШІЗА". Знешне ён схуднеў – ад майго дзіцяці засталася палова. У Мікіты і так глыбока пасаджаныя вочы, а цяпер здаецца, што яны кудысьці праваліліся. Цёмныя кругі пад вачыма, усё нейкае вострае стала – нос, падбародак, шчокі запалі. І вельмі халодныя рукі, тонкія, схуднелыя, пальцы доўгія. І я іх усё расцірала, каб хоць неяк сагрэць.

Ведаю, што на вуліцу іх выводзяць раз на тыдзень, і Мікіта сказаў: "Мама, не хвалюйся – я дыхаю ў фортку". Мабыць, у ізалятары ёсць нейкае вакенца, праз якое паступае паветра. І, наколькі мне вядома, харчаванне ў ШІЗА горшае, чым для ўсіх у атрадзе.

У Мікіты захворванне вачэй (прыроджаны астыгматызм) і праблемы з пазваночнікам. І, напрыклад, на "Валадарцы", дзе ён прабыў пяць месяцаў, шконкі, на якіх там спяць, метр семдзесят даўжынёй і з прыпаднятым "падгалоўнікам", а ў яго рост метр дзевяноста пяць. І ў адным лісце, калі яго перавялі з Жодзіна ў Мінск на Валадарскага, ён напісаў: "Заўтра адпраўляюць хлопца ўжо па этапе і я пералягу на яго ложак, ён збоку, дзе можна выцягнуць ногі". А як цяпер у калоніі з гэтым, не ведаю. Больш пра ўмовы утрымання я нічога не магу сказаць, таму што за гадзіну я нават неяк не распытала пра ўсё. Падчас спаткання хацелася больш пагаварыць з ім пра тое, што ён збіраецца рабіць і неяк угаварыць яго заняць іншую пазіцыю. Бо пастаяннае знаходжанне ў ШІЗА здароўя не дадасць, гэта зразумела.

**– А, зыходзячы з таго, што Вы ўбачылі там, што можаце сказаць пра ўмовы ў гэтай калоніі?**

– Па-першае, тэрыторыя калоніі акружаная заводамі – з аднаго боку нафтаперапрацоўчы "Нафтан", з другога – хімічны "Палімір". Як кажа Мікіта, за плотам калоніі – вя-





GAZETABY.COM

# Моц духу (працяг)

лікі самагонны апарат. Я такога ніколі не бачыла: мы хвілін дзесяць толькі ўздоўж завода ехалі і там усё трубы, трубы, нейкія ёмістасці, зноў трубы. І паветра нейкае кіслае – ці то кіслата, шчолач, нейкая хімія. Калі мы пад'ехалі да калоніі, кіслатой пахла не моцна. Але сам выхавацель сказаў, што калі змяняецца накірунак ветру, гэты пах узмацняецца.

На маю просьбу пра перадачу фільтра для вады мне адказалі, што ніколі такога не бралі і гэта толькі з дазволу кіраўніцтва. Спыталі, а што не так з вадой. Кажу, што раз такое паветра, то адбываюцца нейкія выкіды, і я не думаю, што ёсць добрая ачышчальных сістэма. Кажуць, маўляў, мы ж п'ём. Я кажу, што вы прыйшлі, закіпяцілі, увечары сышлі дадому, а яны 24 гадзіны і п'юць гэтую ваду, і мыюцца. Таму буду размаўляць з кіраўніцтвам, каб прынялі ў мяне гэты фільтр для вады...

Па-другое, тэрыторыя калоніі маленькая. Я спытала, ці ёсць у іх нейкія спартовыя пляцоўкі – акрамя валейбольнай, нічога няма, таму што няма месца, як мне сказалі. Наогул турма размяшчаецца ў былых бараках для будаўнікоў, якія будавалі гэты завод. Будынкі старэнькія, афарбаваныя ў белы колер. Каля адміністрацыйнага будынка ёсць нейкія дрэвы, ялінкі, газончыкі. А ўжо калі мяне вялі па тэрыторыі, бачыла будынак аднаго з атрадаў: агароджаны сеткай, вакол асфальт і пясок са жвірам, гэта значыць, няма ні дрэў, ні іншай расліннасці. Ды і пра якую расліннасць можа ісці гаворка, калі вакол два заводы. І, як мне сказалі людзі, дзеці ў Наваполацку ад нараджэння пакутуюць ад вельмі моцнай алергіі. Значыць, гэта паветра дрэнна адбіваецца на здароўі. Экалогія, зразумела, там нядобрая.

**– Вы сказалі, што хацелі ўгаварыць Мікіту заняць іншую пазіцыю...**

– Так. У калоніі ён прадстаўляецца незаконна асуджаным, не падпісвае паперы. Ён падымаецца зранку, выходзіць на зарадку – але стаіць. Калі ў яго пытаюцца, чаму ён стаіць і не робіць практыкаванні, ён адказвае, што пакуль з яго не здымуць абвінавачванне, ён незаконна асуджаны і іх умовы выконваць не будзе. Гэта значыць, такім спосабам ён спрабуе пратэставаць. Я з ім размаўляла пра гэта і ён кажа: "Мама, мне не цяжка падняць рукі, але, падняўшы, я прызнаю прысуд законным"...

Сустрэча з сынам у мяне была 27 траўня, у дзень народзінаў Мікіты, а 26-га былі вынесеныя прысуды Статкевічу, Усу, Буланаву, Класкоўскаму, і ён у мяне спытаў пра прысуды. Не сказаць я не змагла, таму што ён выдатна ведае, што я ў курсе. І калі ён даведаўся, што Усу далі пяць з паловай гадоў, кажа: "Мама, і за што? А ты ў мяне пытаешся і кажаш падняць рукі ... " І што яму на гэта запярэчыць?

Я разумею, што гэта такі яго спосаб барацьбы, але ж не там трэба змагацца. Я яму казала, што, каб нешта змяніць у сістэме, ты павінен быць, перш за ўсё, здаровы. Калі ты хочаш нешта мяняць – то не там. Ніхто цябе не прымушае змяніць сваім прынцыпам, поглядам – зрабі ты гэтую зарадку для сябе, гэта ўсё часова...

# Рух "За Свабоду" разгортвае кампанію ў падтрымку Мікіты Ліхавіда, мэта якой – не проста людскае стаўленне да яго ў калоніі, а вызваленне

Рух звяртаецца да беларусаў праз інтэрнэт і ўлёткі пісаць лісты салідарнасці з Мікітам, а таксама аказаць маральна-палітычны ціск на кіраўніцтва калоніі. Юнак цярпіць за тое, каб наступным разам нашыя з вамі галасы сапраўды лічылі!

У выпадку, калі адміністрацыя Наваполацкай калоніі не адрэагуе і не спыніць дадатковы пераслед рухаўца, будзе зроблены зварот да Еўразвяза ўключыць яе ў спіс неўязных на сваю тэрыторыю.

Разам з тым пра лёс Мікіты Ліхавіда і іншых палітвязняў будуць інфармавацца замежныя арганізацыі і асобныя палітыкі, ад якіх залежыць вырашэнне пытання наконт выдзялення крэдытаў для Беларусі.

Падтрымаць хлопца можна дасыланнем лістоў на адрас:

***211440, г. Наваполацк, вул. Тэхнічная, 8***
***Выпраўленчая Калонія № 10***
***Мікіту Ліхавіду***

Можна напісаць і тамтэйшай адміністрацыі, якая помсліва ламае маладога беларуса, – нагадаць, што за ўсё давядзецца сплочваць:

***211440, г. Наваполацк, вул. Тэхнічная, 8***
***Начальніку Выпраўленчай Калоніі № 10***
***Сівоху Аляксандру Мікалаевічу***

Ці затэлефанаваць туды:
прыёмная начальніка:
тел./факс ***(8-02145) 557127***
кадравы апарат: тел. ***(8-02145) 77143, 77130***

# Дэвальвацыя даверу

**У Беларусі не толькі эканамічны крызіс, але і назіраецца няўхільнае падзенне даверу насельніцтва да ўладаў. То бок, крызіс пакрысе перарастае ў сацыяльна-палітычны.**

Напрыклад, 51% беларусаў лічаць, што праблемы з валютай у краіне – гэта вынік дрэннай эканамічнай палітыкі беларускіх уладаў. А 26% упэўненыя ў тым, што гэта наступства сусветнага эканамічнага крызісу, а 13% наракаюць на дзейнасць сілаў, зацікаўленых у падрыве стабільнасці ў краіне. Гэткія вынікі травеньскага апытання НІСЭПД (Вільня). То бок, народ не верыць у тое, што трубіць афіцыйная прапаганда. Гэта пры тым, што 76% беларусаў атрымліваюць інфармацыю пераважна праз тэлебачанне.

Паказальна і тое, што 55% беларусаў не вераць у асноўную версію тэракту 11 красавіка ў мінскім метро – што яго здзейсніў тэрарыст-адзіночка з нездаровай псіхікай.

28% лічаць, што асуджаныя за Плошчу ні ў чым не вінаватыя, 25% лічаць, што вінаватыя, але прысуды надта жорсткія. 14% не вызначыліся са сваёй пазіцыяй альбо баяцца яе агучваць. 25% мяркуюць, што выракі адпавядаюць віне асуджаных, а 8% лічаць, што яны залішне мяккія.

А як тут будзеш давяраць уладам, калі на кожным кроку мінімум недагаворванне і замоўчванне. Свежы прыклад.

Нацбанк днямі адрапартаваў, што "рублёвыя і інвалютныя ўклады насельніцтва ў пераліку на нацыянальную валюту на пачатак чэрвеня дасягнулі 27,7 трыльёна Br (на 1 студзеня 2011 г. яны складалі амаль 23 трыльёнаў Br). Іх павелічэнне абумоўлена ўстанаўленнем новага цэнтральнага значэння рублёвага кошту кошыка замежных валют у сувязі з выхадам 24 мая на адзіны раўнаважны курс беларускага рубля на ўсіх сегментах унутранага валютнага рынку".

"Як вядома, у адпаведнасці з беларускім заканадаўствам у нашай краіне гарантуецца поўная захаванасць зберажэнняў насельніцтва ва ўсіх банках", – даводзіць Нацбанк, на што пасля дэвальвацыі беларусы могуць толькі горка ўсміхнуцца.

*Цяперашнія даходы цалкам дазваляюць нармальна харчавацца толькі палове беларусаў.*

Што ж тычыцца "адзінага раўнаважнага курса беларускага рубля на ўсіх сегментах унутранага валютнага рынку", то гэта не адпавядае рэчаіснасці. У гандляроў і на "чорным рынку" долар каштуе 6 тысяч рублёў (курс Нацбанку – 5 тысяч).

Паводле апытання, найбольшы давер у беларусаў да долара – 45%. На другім месцы толькі загарантаваны беларускі рубель – 23%, на трэцім еўра – 21%.

Яшчэ далей за Нацбанк пайшоў кіраўнік краіны: ён назваў еўра і долары паперкамі, якімі напампоўваюцца сусветная і еўрапейская эканомікі, што можа прывесці да іх абвалу. Пакуль жа фактам ёсць абрынанне беларускіх рублёў і інфляцыя.

Цяперашнія даходы цалкам дазваляюць нармальна харчавацца толькі палове беларусаў. Такія вынікі згаданага апытання НІСЭПД (Вільня). Прычым праводзілася яно 10-20 траўня – гэта значыць, да афіцыйнай дэвальвацыі, пасля чаго цэны яшчэ больш папаўзлі ўверх. 9,7% беларусаў адказалі, што іх даходы не дазваляюць нармальна есці, а 40,3% – ледзьве дазваляюць.




Што тычыцца адзення і абутку, то сітуацыя яшчэ горш – адпаведна 24,2% і 51,3% адказалі, што іх сямейныя бюджэты не дазваляюць або ледзь дазваляюць нармальна апранацца.

Што тычыцца буйных пакупак (мэбля, кватэра, машына), то не дазваляюць нармальна іх рабіць даходы 78,2% беларусаў, ледзь дазваляюць 17,9%. І гэта толькі пачатак крызісу, пачатак існавання на заробкі, што здзьмуліся пасля выбараў. Хаця вось многія апошніім тыднямі, пазбаўляючыся ад беларускіх рублёў, інвеставалі іх што толькі можна. Нават вядомы патрыятычна-спажывецкі лозунг перафразавалі ў "Раскупляй беларускае!"

Але пра гатоўнасць узяць удзел у масавых акцыях пратэсту і страйках кажуць толькі 8% рэспандэнтаў. Хаця зноў жа – гэта лічба дадэвальвацыйная.

І ўсё ж, маштабнай хвалі пратэстаў бліжэйшым часам чакаць не выпадае, бо беларусы яшчэ не адчулі грунтоўнага падзення ўзроўню жыцця. Цярплівасць (пакуль?) сілкуюць назапашванні, занятасць выжываннем, мінімізацыяй наступстваў крызісу і спадзевы, што сітуацыя выправіцца. І, натуральна, застрашанасць.

Аднак патэнцыял масавых пратэстаў значны. Стыхійныя пратэсты ў Брузгах, акцыя "Стоп-бензін", "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі" – гэта можа быць толькі пачаткам пераменаў. І важна, каб пратэсты былі акумуляваныя менавіта дэмакратычнымі сіламі – і прычым праеўрапейскімі.

**Аляксандр ЗЯНЬКОЎСКІ**

# Крызіс і вёска

Андрэй ЮРКОЎ, эканаміст

Новы сельскагаспадарчы сезон пачаўся досыць супярэчліва. Упершыню за ўсе гады незалежнасці Мінсельгасхарч адрапартаваў аб стоадсоткавай гатоўнасці да сяўбы. У прынцыпе, так яно і ёсць. Але…

Угнаенняў праз абласныя структуры завезлі дастаткова. Сродкі абароны раслін прыватныя фірмы таксама завезлі ў ранейшых дакрызісных аб'ёмах, што досыць дзіўна. Бо казка скончылася, а як забраць з калгасаў цяпер валюту за тавар, ніхто не ведае. Тэхнікі ў так званы лізінг нагналі процьму. Па нашай сацыялістычнай сістэме плацім капейкі (5%) ад поўнага кошту машыны і амаль без адсоткаў (1-2% гадавых) у нашых "зайцах" на 8-10 год у растэрміноўку. Прытым далейшыя плацяжы можна і не рабіць, тэхніку ніхто назад яшчэ не забіраў. Даходзіць да такіх дзівосаў, што калгасу больш выгадна купіць не запчастку на паламаны трактар, а заплаціць першы ўнёсак і ўзяць новы. Паліва аналагічна даецца ў крэдыт без адсоткаў і з ясна бачнай перспектывай невяртання.

Таму сяўба прайшла досыць спрытна, але, хутчэй за ўсё, так добра пры сацыялізме ў першы і апошні раз. Пачалі "вылазіць" і першыя крызісныя з'явы. Завоз запчастак і камплектуючых на імпартную тэхніку практычна спыніўся. Тое, што засталося на рынку, падскочыла ў цане ў 3-4 разы і стала непад'ёмна прадпрыемствам. Падаражэла паліва, наперадзе – газ, электрычнасць. Цэны ж на сельгаспрадукцыю па савецкай завядзёнцы ўстанаўліваюцца манапольна і падвышаюцца ў апошнюю чаргу пад лухту аб харчовай бяспецы. Рэальны куш у гэтай сітуацыі здымаюць перапрацоўшчыкі-экспарцёры: малзаводы, мясакамбінаты. Бо на экспарт ідзе больш за палову прадукцыі, а кошт валюты нават паводле Нацбанку сёння ўжо зусім іншы. Але дадатковыя сродкі гэтыя ідуць у асноўным на пагашэнне даўгоў перад банкамі. Бо за апошнія гады пад мэтай быццам інвестыцый на перапрацоўчыя прадпрыемствы без грунтоўных падстаў было закуплена за мяжой за валюту вельмі дарагое абсталяванне. Тая самая праблема і з калгасамі, але ім і плаціць ужо няма чым.



*...значная частка вяскоўцаў настроеная кансерватыўна і будзе выступаць супраць зменаў у эканоміцы.*

Рэакцыя ўлады на гэтыя падзеі, на жаль, пакуль адсутнічае. Наша ўладная сістэма на ўсіх узроўнях дэманструе поўную няздольнасць эфектыўна дзейнічаць ва ўмовах крызісу. Калі на дзяржаўным узроўні адчуваецца, што ўраду стала трохі не да калгасаў, дык па месцах проста жах.

Раённыя вертыкальшчыкі, чыноўнікі ўсіх масцей замест таго, каб шчыра сказаць народу "Капец! Ратуйцеся хто можа і прабачце за здзейсненае!", сноўдаюць па прадпрыемствах, аддаючы чарговыя порцыі бязглуздых загадаў. Відаць, такім чынам дэманструюць вірную барацьбу з заняпадам эканомікі. Просты ж люд, у сваю чаргу, напэўна, у першы раз за апошнія 17 гадоў задумаўся і нават выглядае трохі разгубленым.

Так, з аднаго боку, цэны рэзка скокнулі ўгору. Заробкі асноўная маса сельгаспрадпрыемстваў атрымлівае ў крэдыт, г.з. практычна яны выплочваюцца з бюджэту пад ціскам вертыкалі. Таму працаўнікі вёскі цудоўна разумеюць, што нават тыя невялікія грошы (800 тысяч – 1 мільён 200 тысяч) і доступ да калгаснай тэхнікі, насення, паліва і г.д існуюць толькі дзякуючы пераразмеркаванню сённяшняй уладай сродкаў з іншых галін. Любыя рынкавыя рэформы пакладуць канец гэтай заганнай, але для жыхароў вёскі звыклай і дазваляючай выжыць сістэмы. Таму вельмі значная частка вяскоўцаў настроеная досыць кансерватыўна і будзе выступаць супраць так патрэбных зменаў у эканоміцы.

І гэты чыннік, на мой погляд, ёсць адной з найбольшых пагрозаў на шляху будучага рэфармавання вескі. Бо рэальна сельскай гаспадарцы свеціць два шляхі на перспектыву, і абодва вельмі няпростыя. Гэта абумоўлена тым, што магчымасці па субсідаванні вёскі з іншых галін ужо практычна вычарпаныя. Таму захаваць існуючы лад нерэальна. А вось як будзем адаптавацца да новых умоваў – гэта пытанне. Калі пакінем усё як ёсць, сельскую гаспадарку чакае хуткі заняпад. Вертыкаль, не маючы рэсурсаў, будзе толькі прыспешваць развал сваёй манерай кіравання. Іншы шлях (рэформаў) таксама прывядзе ў кароткачасовай перспектыве да заняпаду.

Але тут галоўнай праблемай будзе амаль поўная адсутнасць прыватнай ініцыятывы і брак добра матываваных адмыслоўцаў. Але калі здолеем у сціслыя тэрміны знайсці, адукаваць і заахвоціць вясковых бізнесменаў, дык справы хутка пойдуць угору. Што тычыцца перспектывы атрымаць танныя і якасныя прадукты, на жаль, чакаць станоўчых вынікаў пакуль не выпадае. Эфектыўнасць сельгасвытворчасці вельмі нізкая.

Таму яшчэ нямала часу галандская бульба, польскія яблыкі, украінская гарэлка будуць вабіць нашае вока на паліцах. І сёння нам вельмі важна вызначыць прадукты, якія мы сапраўды у стане вырабляць плённа і якасна. Каб нарэшце нашы суседзі пачалі паважаць беларускі тавар не толькі за нізкі кошт, але і за лепшыя, чым уласныя, смак і карыснасць.

# Някляеў – лаўрэат прэміі "За свабоду думкі"



**Новым лаўрэатам прэміі "За свабоду думкі" імя Васіля Быкава, заснаванай лідарам Руху "За Свабоду" Аляксандрам Мілінкевічам у 2008 годзе, стаў паэт, экс-кандыдат у прэзідэнты на выбарах-2010 Уладзімір Някляеў. Прызначэннем прэміі з'яўляецца ўслаўленне моцы думкі і духу, плённай працы на ніве беларушчыны.**

Імпрэза па ўшанаванні лаўрэатаў прэміі арганізуецца штогод у вёсцы Бычкі, што на Вушаччыне Віцебскай вобласці (на радзіме Васіля Быкава), блізка па даце да дня народзінаў славутага беларускага пісьменніка (19 чэрвеня).

Прэмію "За свабоду думкі" да гэтага атрымалі літаратары Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў, Павал Севярынец, мастак Алесь Пушкін, краязнаўца Ада Райчонак. Лаўрэаты прэміі ўзнагароджваюцца бронзавымі статуэткамі "За свабоду думкі" аўтарства скульптара Віктара Копача і памятнымі дыпломамі.

Новага ўладальніка прэміі па традыцыі выбралі лаўрэаты мінулых гадоў.











# Вызначаны пераможцы конкурсу "Страху няма"

**Першы этап кампаніі "Страху няма!" завершыўся падвядзеннем вынікаў аднайменнага конкурсу.**

Нагадаем, яе праводзіць ініцыятыва "Беларускі выбар", у якую ўваходзяць Рух "За Свабоду", Саюз "За мадэрнізацыю", Партыя БНФ, Беларуская партыя "Зялёныя", Партыя свабоды і прагрэсу.

Мэта кампаніі – разбурэнне атмасферы страха ў грамадстве, стварэнне настрою салідарнасці і адзінства, раскрыццё творчага патэнцыялу ўдзельнікаў, кансалідацыя прыхільнікаў перамен на глебе агульнай перамогі над страхам, які прадукуе дыктатура.

Конкурс быў абвешчаны на лепшую творчую рэалізацыю слогану кампаніі.

Пераможцамі сталі Юрась Шпак-Рыжкаў (намінацыя "Лепшы малюнак"), Андрэй Кабанаў ("Лепшае фота") і Віталь Чмель ("Лепшая гісторыя").


















МАЛЮНКІ ЮРАСЯ ШПАКА-РЫЖКАВА

Газета выдаецца Рухам "За Свабоду". Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна. Падпісана ў друк 19.06.2011 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by